# Ад Рэдакцыйнае Калегii

Жменька беларускіх інтэлігентаў–каталікоў пастанавіла выдаваць „Адраджэньне“ — часапіс для Беларусаў–каталікоў. Кіруемся сваім сумленьням. Уважаем, што ўжо апошні час пачаць такое выдавецтва. Расьцярушаныя на чужыне, пакіненыя без апекі Беларусы–каталікі патрабуюць мець свой часапіс, у каторым маглі–б знайсьці парады й выясьненьні ўва ўсіх балючых пытаньнях. А сярод пытаньняў–патрэбаў, вымагаючых выясьненьня, штодзенных і надзвычайных, ёсьць адно вельмі важнае — як нам жыць далей на чужыне? Куды, у які бліжшы ці далёкі край, у Эўропе ці за океан выяжджаць, і як арганізаваць гэты выезд?

Але важнейшая й за гэтую яшчэ іншая справа — гэта справа нашае людзкой і нацыянальнай вартасьці. Найперш, справа нашага вечнага збаўленьня і маральнага, людзкага жыцьця на гэтым сьвеце, жыцьця, дастойнага стварэнцаў Божых. А другі бок гэтае справы ёсьць жыцьцё нацыянальнае. Калі Бог нам судзіў быць апрычоным народам, дык трэба гэты дар Божы, гэтую апрычонасьць захаваць, трэба жыць нацыянальным жыцьцём, усебакова яго разьвіваючы, ды трэба й зьвярнуць тое, што ўтрачана нашымі прэдкамі ўлучна зь незалежнасьцяй нашага народу й краіны. Дык адраджэньне рэлігійна–маральнае й нацыянальнае ёсьць аснаўным а галоўным заданьням нашае працы. Калі мы будзем людзьмі маральнымі, цэннымі Беларусамі–Крывічамі, дык Бог нам паможа, ніколі мы ня зьгінем, а выбудуем сабе й свайму народу шчасьлівую будучыню. А без маральнасьці згніём нават у найлепшых варунках.

Маем наўвеце працу сярод Беларусаў–каталікоў, але й агульна–беларускія справы ўважаем за свае, бо тым самым, што яны ўсебеларускія, яны й нашыя. Агульна–беларускіх спраў мы ня можам і ня будзям абмінаць.

Пачынаем сваю работу з малога, цыклястылёвага часапісу–месячніка, бо маем любоў да свайго народу і веданьне ды знацьцё жыцьця й патрэбаў нашых уцекачоў, а сяродкаў матар’яльных ня маем. Аднак мы пэўныя, што нашыя суродзічы Беларусы–каталікі, што гэтулькі выцерпелі ад чужнікоў за сваю веру, гэтак загартаваліся ў абароне свайго каталіцтва, што так здольныя да ахвярнасьці, прыйдуць нам із помачай моральнай, арганізацыйнай і матар’яльнай. Супольнымі сіламі мы пераможам усе перашкоды, і часапіс наш пабольшае і будзе часьцей выходзіць (хоць–бы раз на тыдзень) ды друкам. Няхай ён станецца сьветачам вялікай беларускай каталіцкай арганізацыі, што мае паўстаць у найбліжшым часе.

Мы пэўныя, што й Беларусы праваслаўныя нам будуць прыяць, бо работа, пачатая намі, карысная й канечная таксама з гледзішча патрэбаў усяго беларускага народу.

# За родную мову ў жыцьці рэлігійным і ў сьвятынях

...Ідзеце і навучайце ўсе народы,
хрысьцячы іх у Імя Айца,
Сына і Духа Сьвятога...
*Мат., 28—19.*